Источник: "Веды" - 2012-10-29

# Як на Беларусь прыйшла «чыгуначная цывілізацыя»

Чыгунка – гэта не толькі эканамічны поспех, дасягнуты з яе дапамогай. Гэта таксама і адзін з яркіх гістарычных прыкладаў уздзеяння на соцыум тэхнагеннага фактару. Для Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя яна з'яўлялася цэнтрам навуковай думкі і тэхнічнай практыкі. Разам з чыгункай прыйшлі і іншыя «цуды» навукова-тэхнічнага прагрэсу таго часу: вадаправод, тэлеграф і тэлефон, электрычнасць. Чыгунка – гэта і першыя на тэрыторыі Беларусі навучальныя ўстановы па падрыхтоўцы кваліфікаваных тэхнічных кадраў.

Відавочная актуальнасць і знакавасць чыгункі ў мінулым і сучасным Беларусі парадзілі неўтаймаваную цікавасць да яе як гістарычнай з'явы, жыццядзейны нарыс якой напоўнены фенаменальнымі, да канца недаследаванымі фактамі і падзеямі. Нават пытанне аб пачатковай даце Беларускай чыгункі да нядаўняга часу было даволі заблытаным. Як адно з ключавых у беларускай гісторыі, яно ўзнікла на мяжы XX-XXI стагоддзяў. Менавіта тады была пастаўлена пад сумненне дата 1871 год у якасці адпраўной кропкі ў гісторыі Беларускай чыгункі. Нават калі прыняць да ўвагі, што Маскоўска-Брэсцкая лінія прайшла праз усю тэрыторыю Беларусі і злучыла Мінск з Масквой, то і тады трэба ўлічваць, што гэтая лінія была далёка не першай па часе пабудовы на тэрыторыі Беларусі. Першай жа чыгуначнай лініяй, пракладзенай на беларускай зямлі, стаў участак Парэчча – Гродна Санкт-Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі. А дата – 15 снежня (27 – па новым стылі) 1862 года – стала днём нараджэння Беларускай чыгункі. Упершыню навукова абгрунтаванае і дакументальнае пацвярджэнне гэтага адлюстравана ў навукова-папулярным выданні «История Белорусской железной дороги. Из века XIX в век XXI», прэзентацыя якога адбылася 18 кастрычніка ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я.Коласа НАН Беларусі.

Прэзентацыя пачалася з дэманстрацыі фільма «Дарога даўжынёй у 150 гадоў», падрыхтаванага супрацоўнікамі аддзелаў сацыякультурнай і інфармацыйнай дзейнасці, аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў бібліятэкі сумесна з супрацоўнікамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Загадчыца сектара кнігазнаўства аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ Алена Цітавец азнаёміла прысутных з экспазіцыяй выставы «Беларуская чыгунка: ад мінулага да сучаснага», на якой было прадстаўлена больш за 100 дакументаў XIX-XXI стагоддзяў, якія распавядаюць пра 150-гадовую гісторыю беларускай магістралі.




Намеснікам начальніка Беларускай чыгункі Пятром Стоцкім была адзначана ўнікальнасць прэзентуемага выдання як па аб'ёме і якасці прадстаўленага матэрыялу, так і па ўзроўню паліграфічнага выканання. Акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр Каваленя ў сваім выступленні падкрэсліў, што святочнай прэзентацыі кнігі папярэднічала вялікая і складаная праца аўтарскага калектыву беларускіх гісторыкаў і прадстаўнікоў Беларускай чыгункі пад кіраўніцтвам загадчыцы аддзелам гісторыі беларускай дзяржаўнасці Інстытута гісторыі кандыдата гістарычных навук Валянціны Яноўскай. Паводле меркавання дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вячаслава Даніловіча, у выніку плённага супрацоўніцтва калектываў Упраўлення Беларускай чыгункі і Інстытута гісторыі было створана ўнікальнае навукова абгрунтаванае выданне, якое з'яўляецца захавальнікам памяці аб шматлікіх пакаленнях чыгуначнікаў.

**Беларуская чыгунка мае сваю гісторыю, сваё багатае мінулае. Пачынаючы з сярэдзіны XIX стагоддзя чыгунка аказвае вялікі ўплыў на сацыяльнае і эканамічнае развіццё Беларусі. Менавіта яна стала вырашальным фактарам уцягвання беларускай эканомікі спачатку ва ўсерасійскія, а затым і еўрапейскія рынкавыя працэсы.**

У сваю чаргу В.Яноўская распавяла аб вялікай працы па стварэнню кнігі і дапамозе калег з Брэста, Гродна, Літвы, Латвіі, Польшчы па збору матэрыялу. Яна падкрэсліла, што дадзеная праца раскрывае працэс станаўлення чыгуначнай сеткі на тэрыторыі Беларусі, асвятляе яе дзейнасць у розныя эпохі, адлюстроўвае працэсы мадэрнізацыі і сучаснага стану Беларускай чыгункі.

Сапраўды, кніга ўражвае – як сваім памерам, так і зместам. Прымаючы да ўвагі апошнія навуковыя павевы і ўлічваючы ступень распрацаванасці гісторыі Беларускай чыгункі, у дадзеным навукова-папулярным даследаванні аўтарскі калектыў вызначыў сваёй задачай раскрыць асноўныя этапы фарміравання чыгуначнай сеткі на тэрыторыі нашай краіны, паказаць удзел чыгуначнікаў у сацыяльных і ваенна-палітычных канфліктах, уплыў чыгуначнага фактару на развіццё сацыякультурнага асяроддзя рэгіёна на розных этапах гістарычнага развіцця, прасачыць асноўныя працэсы мадэрнізацыі і сучаснага стану і даляглядаў Беларускай чыгункі.




Для стварэння яе гісторыі была выкарыстана вялікая колькасць апублікаваных і неапублікаваных крыніц, выяўленых у архівасховішчах Беларусі, Расіі, Украіны і Літвы. Дарэчы, амаль 100 старонак займае дадатак, у якім праілюстравана гісторыя Беларускай чыгункі ў дакументах.

Кніга мае багаты выяўленчы матэрыял, пры гэтым значная частка здымкаў з Беларускага дзяржаўнага архіва кінафота-фонадакументаў, асабістых калекцый даследчыкаў з Латвіі, Нацыянальнага чыгуначнага музея Англіі і г.д. друкуецца ўпершыню.

**Валянцін МАЗЕЦ,**
**Алена ФІРЫНОВІЧ,**
**Інстытут гісторыі НАН Беларусі**

**Фота С.Дубовіка, «Веды»**

**На фота: П.Стоцкі ўручае падзяку В.Яноўскай**

Валянцін Мазец, Алена Фірыновіч. Як на Беларусь прыйшла «чыгуначная цывілізацыя»